**УДК 940.5(438)**

# АБРАННЕ ПАПЫ ЯНА ПАЎЛА II І ЯГО ПЕРШЫ ВІЗІТ У ПНР

***К.В. ЛАЎРЫНЕНКА***

*Артыкул прысвечан тэме выбрання папы Яна Паўла II і яго першаму візіту ў ПНР. Паказан уплыў выбрання папай кардынала-паляка на развіццё адносін паміж дзяржавай і Каталіцкім Касцёлам, становішча Касцёла і палітычнае жыццё ПНР у першы год яго пантыфіката.*

Папы рымскія заўсёды адыгрывалі вялікую ролю не толькі ў рэлігійным, але і ў палітычным жыцці многіх краін хрысціянскага свету. У сваім артыкуле аўтар паспрабуе асвятліць уплыў абрання папы Яна Паўла II на становішча Каталіцкага Касцёла і палітычнае жыццё ПНР у першы год яго пантыфікату.

16 кастрычніка 1978 г. папам рымскім стаў паляк, Кракаўскі мітрапаліт Караль Вайтыла, які ўзяў сабе імя Ян Павел II. Выбар кардынала Вайтылы быў вялікім неспадзяваннем для ўсяго свету і асабліва палякаў. Але для тых, хто быў добра арыентаваны ў справах Ватыкана, такі зыход справы прадстаўляўся магчымым, бо што б ні казалі, аднак папскія выбары заўсёды заставаліся актам палітычным [1]. Яшчэ напрыканцы пантыфікату Паўла VI задавалася пытанне, хто ж стане новым папам. Ніхто з італьянскіх кандыдатаў, на думку экспертаў, не быў выдатнай асобай, і не выключалася, што канклаў можа скончыцца нечакана. Як прэтэндэнта, які меў найвялікшыя шансы сярод неітальянцаў, называлася апошнім часам усё часцей імя кардынала Караля Вайтылы. Яго «палітычная» пазіцыя супакойвала «кансерватыўную» фракцыю ватыканскіх курыялістаў, у той жа час «прагрэсіўны» падыход да тэалагічнай і душпастырскай праблематыкі спрыяў бы з'яднанню галасоў кардыналаў паўднёва-амерыканскіх, заходнееўрапейскіх і з краін «трэцяга свету». Акрамя гэтага, узгадваўся і той факт, што ў сакавіку 1976 г. кардынал Вайтыла быў запрошаны правесці вялікапосныя рэкалекцыі для Рымскай Курыі, у якой удзельнічаў папа Павел VI. Не праходзіла між увагі экспертаў, што «L'Osservatore Romano» - орган Ватыкана - прысвячае кардыналу Вайтылу ўсё больш месца. Супраць сябе меў толькі ўзрост: быў занадта маладым для папы (пяцьдзесят пяць гадоў), а доўгія пантыфікаты ніколі не былі карыснымі для Касцёла, - сцвярджаюць знаўцы. Аднак перспектива выбару папы неітальянца была прызнана заўчаснай. Тым не менш, у чэрвені 1978 г., у сядзібе Папскай Рады, у сродках масавай інфармацыі, кардынал Віло, дзяржаўны сакратар, паведаміў кардыналу Вайтылу, што, калі здароўе Паўла VI і надалей будзе пагаршацца, то ён будзе ўзяты пад увагу як кандыдат [2].

6 жніўня 1978 г. памёр Павел VI. Новым папам быў абраны арцыбіскуп Венецыі кардынал Альбіна Лючані, які ўзяў сабе імя Ян Павел I. Але за зачыненымі дзвярыма Сіксцінскай капелы на канклаве прозвішча Вайтылы раз-пораз узгадвалася. Пантыфікат «Папы, які ўсміхаецца», быў, аднак, вельмі кароткім - усяго трыццать тры дні.

3 кастрычніка польскія кардыналы Вышыньскі і Вайтыла прыляцелі ў Ватыкан, каб прыняць удзел ужо ў другім канклаве на працягу 1978 года. Сам перыяд перад канклавам вельмі напамінаў свецкую палітычную кампанію, падчас якой інтарэс да кардынала Вайтылы няўхільна ўзрастаў. Яго імя бесперарыўна з'яўлялася на вуснах палітызаваных кардыналаў. За тры дні да канклава агенцтва «Рэйтэр» называла кардынала Вайтылу сярод papabile. У дзень перад канклавам яго прозвішча з'явілася на старонках «Il Messagero», але ў каментарыях прэсы мажлівасць яго выбару была абыходжана. Кола так званых papabile было тое самае, што і перад 25 жніўня, калі распачаўся папярэдні канклаў. Выказванні будучых удзельнікаў канклава, напрыклад, кардыналаў Себасцьяна Баджа ці Франца Кёніга прадэманстравалі імкненне, якое знайшло сваё выражэнне ў выбары Яна Паўла I - шукаць хутчэй душпастыра, чым курыяліста ці дыпламата, пры чым само паняцце душпастырскіх функцый павінна быць пашырана. Згодна з чатырохсотгадовай традыцыяй чакалася, што новым папам будзе італьянец, хаця некаторыя кардыналы схіляліся да магчымасці выбару неітальянца, лічачы гэта пажаданым для Касцёла. На старонках прэсы рэдка сярод papabile з'яўляліся прозвішчы неітальянцаў - кардынала Эдуарда Піраніа з Аргентины (але італьянскага паходжання) ці кардынала Алаізія Ларшэйдэра з Бразіліі [3].

14 кастрычніка на новапачатым канклаве самымі верагоднымі прэтэндэнтамі на папскі трон былі італьянскія кардыналы Джузэпэ Сіры і Джавані Бенэлі. Аднак неўзабаве іх кандыдатуры аказаліся заблакаванымі, і, нарэшце, ўдзельнікі пачалі думаць аб абранні папы неітальянца. Вечарам 16 кастрычніка падчас восьмага тура галасавання папам быў абраны Караль Вайтыла, кардынал з Польшчы, - ён атрымаў 94 галасы, толькі 17 былі супраць. Узяўшы ў знак павагі да свайго папярэдніка імя Ян Павел II, Караль Вайтыла стаў 262 пераемнікам Св. Пятра і 264 папам Рыма-Каталіцкага Касцёла. Акрамя гэтага, ён быў першым за апошнія 455 гадоў папам неітальянцам (ад часу пантыфікату Адрыяна VI, галандца Дэдэла з Утрэхту, 1522 - 1523), першым папам-палякам і, хутчэй за ўсе, першым папам-славянінам. Да гэтага для

папы ён быў вельмі маладым (меў пяцьдзесят восем гадоў) і паходзіў з краіны, дзе звыш трыццаці гадоў кіравала камуністычная партыя, а Каталіцкі Касцёл падвяргаўся вялікаму ўціску.

У $19^{20}$ новаабраны папа выйшаў да вернікаў і абвясціў сваю першую прамову да іх [4]. Тым часам радасная вестка дайшла да Польшчы, спачатку праз радыё, потым - у вечаровых навінах. Тое, што Вайтыла стаў папам, было вялікім поспехам для польскага Касцёла, ранг якога павысіўся як на міжнароднай арэне, так і ва ўнутраных адносінах з дзяржавай. Уся Польшча лікавала, аднак для прадстаўнікоў урада абранне Вайтылы стала вялікай праблемай. Калі камуністычныя ўлады Варшавы і Масквы зразумелі, што гэта можа прадстаўляць патэнцыйную сур'езную пагрозу для стабільнасці ўсёй камуністычнай сістэмы, яны былі ў шоку, бо такое развіццё падзей стала для іх поўнай нечаканасцю. Улічваючы ўсё больш нарастаючую напружанасць у камуністычных дзяржавах увогуле, а ў ПНР у асаблівасці, і ўлічваючы моцна развітае пачуццё польскай самасвядомасці папы, чакалася, што яго палітычная ўвага сканцэнтруецца ў першаю чаргу на роднай краіне. Аднак Эдвард Герэк, Першы сакратар ЦК ПАРП, не мог не даацэньваць вялікага значэння для палякаў факта абрання папам кардынала з Польшчы. Ён разумеў, што праяўленне хаця б малейшай варожасці ў адносінах да Яна Паула II можа мець непрыемныя вынікі. У той жа дзень Герэк даў распараджэнне, каб танальнасць прэсы і ўсіх сродкаў масавай інфармацыі адпавядала паўсюль устаноўленай у Польшчы атмасферы ўздыму і натхнення. Ужо на наступны дзень, 17 кастрычніка, у сваіх выказваннях для прэсы пасол ПНР у Рыме Станіслаў Трэпчыньскі і прэс-сакратар урада ПНР, міністр Уладзімеж Янюрэк хаця і з вялікай доляй камуністычнай рыторыкі, але ўсяляк падкрэслівалі вялікую важнасць абрання папам кардынала з ПНР [5, 6]. Больш таго, у вышэйшых колах ПАРП у суцяшэнне быў прыняты тэзіс: «Лелей Вайтыла як папа там, чым як Прымас тут».

Прыходзілася выконваць усе фармальнасці, і наступнай праблемай для ўладаў стала віншавальная тэлеграма. Вырашалася, хто павінен яе падпісаць - Эдвард Герэк, Першы сакратар ЦК ПАРП ці Генрых Яблоньскі, старшыня Дзяржаўнага Савета ПНР? Ці можа ўсе ўтрох - Э. Герэк, Г. Яблоньскі, П. Ярашэвіч (прэм'ер-міністр)? Ці няма якіх-небудзь супрацьпаказанняў да высылкі тэлеграмы, бо ў ПНР няма дыпламатычных адносін з Ватыканам? Кіраўнік у справах веравызнанняў званіў у Маскву, Будапешт, Берлін, Прагу, каб даведацца, ці будуць дасланы адтуль тэлеграмы. Між іншым, тэлеграму даслаў і Л. Брэжнеў [7]. 17 кастрычніка была даслана віншавальная тэлеграма Яну Паулу II, падпісаная Герэкам, Яблоньскім і Ярашэвічам, у якой «ад імя народа і ўладаў Польскай Народнай Рэспублікі» выказваліся віншаванні. Але нават у гэтых віншаваннях гучала пэўная ідэалагічная прапаганда [8]. У адказе, які прыйшоў праз два дні, Ян Павел II абышоў маўчаннем усю палітычную рыторыку, засяродзіўшы ўвагу менавіта на праблеме развіцця міждзяржаўных адносін [9]. Абодва дакументы, вельмі дакладна адрэдагаваныя, заклікаI былі служыць справе ўстанаўлення добрых адносін паміж папам і польскім камуністычным рэжымам. Герэк і яго каманда ўсяляк падкрэслівалі значэнне ўзнясення паляка на папскі трон, а Ян Павел II, калі гаварыў пра Польскую Народную Рэспубліку, у сутнасці, легітымізаваў факт яе палітычнага існавання, што было вельмі істотным для польскіх уладаў.

18 кастрычніка адбылася нарада, на якой вырашаліся пытанні, звязаныя з пантыфікатам Яна Паула II і яго наступствы ў сферы адносін Ватыкана, ПНР і Касцёла. Прадстаўнікі ўрада меркавалі, што, па-першае, несумненна страцяць сваё значэнне кантакты з Ватыканам як фактар стрымальны і супакаяльны для пачынанняў касцёльнай іерархіі ў Польшчы. Па-другое, лічылася, што будуць спынены кантакты на лініі Урад - Ватыкан - Біскупат, на змену прыдуць адносіны ўрада з Ватыканам і Біскупатам, што ў біскупы будуць падбірацца непажаданыя для ўладаў кандыдатуры, дэкрэт аб занятасці касцельных пасадаў Касцёлам будзе абыходжаны, пратакол аб устанаўленні сталых рабочых кантактаў паміж ПНР і Ватыканам, падтрыманы «джэнтэльменскай згодай» Казаролі (арцыбіскуп Агасціна Казаролі, сакратар Рады ў Публічных справах Касцёла - міністр замежных спраў у Ватыкане), можа быць фактычна вельмі слабым інструментам стрымлівання, асабліва калі пазіцыя Казаролі аслабне [10]. 19 кастрычніка было вырашана пытанне аб складзе дэлегацыі польскага ўрада на інаўгурацыю папы. Кіраўніком дэлегацыі быў Генрых Яблоньскі. Яго суправаджалі: міністр Казімеж Конкаль - дырэктар Кіраўніцтва ў справах веравызнанняў, Юзэф Чырэк - намеснік міністра замежных спраў, Станіслаў Трэпчыньскі - пасол ПНР у Рыме, Казімеж Шаблеўскі - кіраўнік Камітэта ў справах Сталых рабочых кантактаў з Ватыканам, паўнаважны міністр, Эдвард Баршч - прэзідэнт Кракава [11].

На інаўгурацыі, якая адбылася 22 кастрычніка, прысутнічалі пяць тысяч палякаў, якіх улады ПНР выпусцілі з нагоды такой падзеі. Але трэба заўважыць, што ў Рым былі выпушчаны не ўсе жадаючыя (у асноўным па палітычных матывах). На наступны дзень, 23 кастрычніка, Яблоньскі быў прыняты папам на прыватную размову, затым, пасля агульнай аўдыенцыі, з папам спаткалася ўся ўрадавая дэлегацыя ПНР [12]. Падчас гэтай аўдыенцыі Яблоньскі спрабаваў скіраваць размову на адносіны Касцёла і дзяржавы, а таксама ПНР і Ватыкана, але размова гэта насіла характар у асноўным фармальны і абсалютна нічога не вырашала [13].

Наступнай праблемай, якую трэба было вырашаць польскім найвышэйшым уладам у сувязі з пантыфікатам папы - тэта справа яго прыезду ў ПНР. Ідэя гэтай паездкі нарадзілася ў думках Яна Паула II адразу пасля яго абрання. Гаварыў ён аб гэтым падчас асабістай аўдыенцыі з Г. Яблоньскім і Прымасам Вышыньскім, а таксама 23 кастрычніка, калі, звярнуўшыся да палякаў, паведаміў, што ён вельмі жадае прыехаць у Польшчу на дзевяцісотую гадавіну смерці Св. Станіслава.

17 кастрычніка, на наступны дзень пасля выбару папы, адно з першых пытанняў на прэс-канферэнцыі ў цэнтры Interpress было пытанне ці магчымы будзе прыезд папы. Журналістаў, праўда, запэўнілі, што праблем у гэтым не будзе, але ўсе выдатна разумелі, чаму менавіта гэтае пытанне хвалявала ўсіх. Каталіцкі свет добра памятаў падзеі дванаццацігадовай даўнасці, калі ўлады ПНР адмовілі папу Паўлу VI у праве прыехаць на святкаванне Тысячагоддзя Хрышчэння Польшчы. Аднак тут сітуацыя была больш складанай - свет не зразумеў бы ўлады ПНР, калі б яны адмовілі ў прыездзе папу-паляку. Але і выбар даты паездкі - свята святога Станіслава, які для палякаў быў сімвалам пакутніцтва Касцёла ад дзяржаўнай улады, - быў абсалютна непрымальным для ўрада ПНР. Ужо 21 кастрычніка Казімеж Конкаль, дырэктар Кіраўніцтва ў справах веравызнанняў, у сваім афіцыйным выступленні заявіў: «Калі папа прыедзе ў Польшчу, то ён, безумоўна, будзе сардэчна прыняты як дзяржаўнымі ўладамі, так і вернікамі», аднак пры гэтым было заўважана, што «час выбару і тэрміну прыезду залежаць ад абставін, якія з абодвух бакоў маюць складаны характар» [14]. На пачатку лістапада Герэк больш чым ясна выказаўся на гэтую тэму, што ці прыехаць - гэта вырашае папа, але калі прыехаць - гэта вырашае ўрад ПНР.

Сітуацыя ў сувязі з гэтым усё больш накалялася, Герэк некалькі разоў сустракаўся з Прымасам Вышыньскім, каб пераканаць яго аб неабходнасці пераносу візіта папы на любы іншы тэрмін, толькі не на 8 мая. Аднак і Вышыньскі не мог уплываць на пастановы Ватыкана. Немагчымасць дамовіцца прывяла да стварэння двухбаковай камісіі ў справах прыезду папы. Першы раз камісія сабралася 14 лютага. У яе склад уваходзілі С. Каня, К. Конкаль, Ю. Чырэк, біскупы Б. Дамброўскі, Ф. Махарскі і пралат А. Аршулік. Сакратаром быў А. Меркер [15]. У выніку непахіснай пазіцыі ўладаў біскуп Дамброўскі 20 лютага выляцеў у Ватыкан, каб канчаткова вырашыць пытанне. папа, даведаўшыся пра пазіцыю ўладаў, прапанаваў тэрмін 2 - 1 0 чэрвеня, што было абсалютна незразумета ватыканскімі курыялістамі. Аднак папа патлумачыў, што сваёй краіне ён жадае дабра, а не цяжкасцяў і стварэння канфрантацый.

22 лютага Біскупат даслаў свае запрашэнне папу [16]. Камюніке, якое паведамляла аб гэтым, было надрукавана ва ўсей польскай прэсе 3-4 сакавіка. Тэкст жа ліста старшыні Дзяржаўнага Савета Генрыха Яблоньскага, дасланы 2 сакавіка папу ў сувязі з запрашэннем яго ў ПНР [17], у прэсе апублікаваны не быў. Магчыма, было гэта зроблена, каб дыстанцыявацца ад запрашэння, бо афіцыйна папа быў запрошаны толькі польскім Біскупатам. Гэта дазволіла польскім уладам пазбегнуць незадаволенасці Масквы, калі б папа быў запрошаны імі, але адначасова і захаваць твар перад польскім грамадствам і каталіцкім светам. Ад часу афіцыйнага запрашэння папы ў ПНР пачаліся інтэнсіўныя прыгатаванні. 14 сакавіка ў Цэнтральным Камітэце адбылося пад кіраўніцтвам С. Кані першае пасяджэнне партыйна-дзяржаўнай трупы, якая падрыхтоўвала візіт Яна Паула II. Наступныя пасяджэнні адбыліся тройчы на працягу сакавіка і красавіка. Двухбаковая камісія з 14 лютага да 30 мая збіралася 6 разоў. 25 мая адбылася размова К. Кані і К. Конкаля з біскупам Б. Дамброўскім. 28 мая - спатканне Прымаса Вышыньскага з Э. Герэкам. Віцэ-міністр У. Стахура выляцеў у Мексіку, каб пераняць мексіканскі вопыт у справе прыняцця папы. З 22 па 26 сакавіка ў сувязі з прыгатаваннямі да візіту Яна Паула II у ПНР знаходзіўся арцыбіскуп Агасціна Казаролі.

Візіт папы ў ПНР адбыўся 2 - 1 0 чэрвеня 1979 г., падчас якога ён наведаў Варшаву, Гнезна, Чэнстахову, Кракаў, Кальварыю Зэбжыдоўску, Вадавіцы, Новы Тарг і Асвенцым. Ад гэтага візіту шмат чакалі як і ўлады, так і Касцёл. Касцёл меркаваў аб яшчэ большым прэстыжы і на яго прызнанне - афіцыйнае прызнанне ўрадам. А з гэтага вынікала б у будучым прадстаўленне Касцёлу новага статусу і праў, за што Прымас Вышыньскі змагаўся ўжо шмат гадоў. Спадзяваўся Біскупат на доступ да радыё і тэлебачання: асвятленне візіта папы ў сродках масавай інфармацыі азначала б прарыў ізаляцыі. Прадстаўнікі ж урада спадзяваліся, што візіт Яна Паула II аплаціцца: перш за ўсе папа прадэманструе сваё прызнанне ПНР, адцягне ўвагу грамадства ад крытычнай гаспадарчай сітуацыі. Урэшце, усяму свету будзе прадэманстравана, што камуністычны ўрад без страху прымае папу і дазваляе яму неабмежаваны кантакт з масамі.

Як бы то ні было, аднак, калі не лічыць дробных непрыемнасцяў, такіх як, напрыклад, тэлевізійнае асвятленне папскага візіту, улады хутчэй дапамагалі, чым перашкаджалі ў арганізацыі паспяховай паездкі Яна Паула II па Польшчы. Аднак пры гэтым улады ўсяляк імкнуліся кантраляваць сітуацыю, пацвярджэннем чаму служыць выдадзеная Аддзелам прэсы, радыё і тэлебачання ЦК ПАРП інструкцыя для прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, якім чынам трэба асвятляць ход пілігрымкі. Акрамя гэтага, у інструкцыі пералічвалася, якія журналісты могуць атрымаць акрэдытацыю [18]. У мерапрыемствах, якія праводзіліся подчас пілігрымкі, прыняло ўдзел не менш за 10 мільёнаў палякаў (пры колькасці насельніцтва 35 мільёнаў). Пра тыя дні палякі гаварылі «нашыя дзевяць дзён свабоды» [19].

Што датычыцца характеру візіту, то на гэта пытанне папа адказаў падчас свайго прывітальнага слова ў аэрапорце «Акенца» 2 чэрвеня: «...маё наведванне прадыктавана чыста рэлігійным матывам. Адначасова горача прагну, каб мая пілігрымка ў Польшчы магла служыць вялікай справе збліжэння і супрацоўніцтва паміж народамі, узаемнаму зразуменню, паяднанню і міру ў сучасным свеце. Урэшце жадаю, каб вынікам майго наведвання стала ўнутранае адзінства маіх суайчыннікаў, а таксама далейшае развіцце адносін паміж дзяржавай і Касцёлам у маей ...Айчыне» [20]. Такім чынам, з самага пачатку папа ясна заявіў, што ён прыбыў на радзіму як польскі паломнік, глава Рыма-Каталіцкага Касцёла і дзяржаўны дзеяч адначасова. Аднак, нягледзячы на тое, што папа, каб пазбегчы канфрантацыі з польскімі ўладамі, адмовіўся ад святкавання майскіх урачыстасцяў, звязаных з гадавінай пакутніцкай смерці Св. Станіслава, ён не дазволіў, как аб гэтым забылі. У сваіх выступлениях, пропаведзях і малітвах папа шмат разоў звяртаўся да імені святого, што, безумоўна, нервавала ўлады. Так, ён успамінаў яго ў сваім выступленні падчас імшы на плошчы Перамогі ў Варшаве 2 чэрвеня, у прамове да Пленарнай Канфе-рэнцыі Біскупату Польшчы ў Чэнстахове 5 чэрвеня, у выступленні да моладзі ў Кракаве 8 чэрвеня, цалкам асобе Св. Станіслава ён прысвяціў сваю прамову да замежных гасцей у Кракаве 9 чэрвеня [21]. Уладам прыйшлося змірыцца з гэтымі выступленнямі папы, у якіх, ім здавалася, гучыць палітычны падтэкст (што так і было), і толькі «Trybuna Ludu» - палітычны орган ЦК ПОРП - пракаменціравала гэта наступным чынам: «Цяжка сказаць, дзе заканчваецца пастырская праца і пачынаецца палітыка».

Неаднаразова падымаў папа і праблему, за якую ад часоў II Ватыканскага Сабору змагаўся Польскі Касцёл - праблему правоў чалавека. У сваіх прамовах да ўладаў ПНР у Бэльведэры 2 чэрвеня ён прыпамінаў аб асноўных правах чалавека [22]. Падымаў ён таксама праблему нармалізацыі адносін Касцёла і дзяржавы, калі прамаўляў да ўладаў і да Пленарнай Канферэнцыі Біскупат Польшчы [23]. Узнімаў папа яшчэ адну тэму, што, безумоўна, было вельмі непрыемна ўладам: ён некалькі разоў напамінаў, што здолеў наведаць Польшчу як папа, у той час як Павел VI вельмі гэтага жадаў, аднак не здзейсніў.

Сітуацыя, якая склалася ў ПНР, была выключнай. Як заўважыў Казімеж Конкаль: «Першы раз за 35 гадоў у краіне адбывалася публічная маніфестацыя незвычайна шырокага ахопу, якая была дастурная мільенам людзей аудыёвізуальна - першы раз пад іншым лозунгам, чым сацыялістычны». Гэта выдатна разумеў папа, а таксама і сітуацыю, у якой знаходзіліся польскія ўлады, заўседы залежныя ад Масквы, пацверджаннем чаму былі яго словы (праўда, з пэўнай доляй іроніі) падчас развітання ў аэрапорце «Баліцэ»: «Гэтае безпрэцэдэнтнае здарэнне было, несумненна, актам пэўнай адвагі з абодвух бакоў» [24].

Як жа можна ацаніць уплыў выбару папы-паляка і яго першы візіт у ПНР на тагачаснае развіцце і далейшыя падзеі ў краіне? Перш за усё, пасля выбару Вайтылы Польскі Касцёл атрымаў вялікую падтрымку папы, пачуццё сілы і недатыкальнасці. Выбар Яна Паўла II стварыў камуністычнай сістэме беспрэцэдэнтныя цяжкасці ў абмежаванні дзейнасці Касцёла, ўзмацніў зацікаўленасць Польшчай у свеце, узняў нечаканы прыплыў рэлігійных пачуццяў і даў больш духоўнай незалежнасці польскаму грамадству ад камуністаў. У польскага грамадства з’явіўся харызматычны абаронца не толькі ў рэлігійных справах - прыслухоўваліся да меркаванняў папы таксама ў справах прыватнага і грамадскага жыцця. Гэтую незалежнасць грамадства ад камунізму канчаткова ўсвядоміў народу, уладзе і ўсяму свету першы візіт у ПНР Яна Паўла II. Для ўладаў ПНР было гэта непазбежным вынікам выбару папы. 1 хаця яны добра разумелі, што гэты візіт створыць вялікую перашкоду ў іх імкненні да татальнага панавання ў грамадстве, аднак не маглі гэтаму перашкодзіць. Маглі толькі імкнуцца да мінімалізацыі негатыўных для сябе вынікаў і стараліся гэтага дасягнуць, хоць без яснай канцэпцыі. Спрабавалі зменшыць значэнне візіту праз абмежаванне інфармацыі ў сродках масавай інфармацыі, асабліва ў тэлебачанні, і навязванне абмежаванняў у выбару трасы пілігрымкі па краіне. Аднак пры гэтым усяляк падкрэслівалі дзяржаўны ранг візіту і дэманстравалі свае сустрэчы з папам.

Але, безумоўна, вялікім перавелічэннем было б сказаць, што візіт папы стаў непасрэднай прычынай «жніўня 1980» у ПНР. Ісціна ў тым, што незалежна ад абрання Вайтылы папам і яго паездкі 1979 г., сітуацыя ў краіне была крытычнай і ў любы момант пагражала выбухам, тым больш, што ў 1956, 1970 і 1976 гг. ужо даходзіла да крывавых сутыкненняў. I хаця не трэба ўжо было ўмяшальніцтва звонку, аднак і такі фактар, як з’яўленне папы-паляка ў сітуацыі асаблівага напружвання і ўзмацнення патрыятычных настрояў, несумненна, паўплываў на тагачасную сітуацыю і стаў адной з прычын развіцця падзей у наступным дзесяцігоддзі ў ПНР.

## ЛІТАРАТУРА


1. Шульц Т. Иоанн Павел II. - Мн.: ООО «Попурри», 2000. - С. 317.
2. Morawski D. Pomost na Wschód. Obserwacje i refleksje watykanisty. Londyn-Lublin: Odnowa-Norbertinum, 1991. - S. 68.
3. Podsiad A., Szafrańska A. Pierwsze dni pontyfikatu Jana Pawła II. W.: Instytut Wydawniczy PAX, 1979. - S. 9.

4. Przemówienie Papieża Jana Pawła II do wiernych w dniu 16.X.1978 na placu św. Piotra // Tygodnik Powszechny. - 1978. - 22 października. - S. 1.
5. Wypowiedź ambasadora Polskiej Rzeczypospolitej Ludowej w Rzymie // Słowo Powszechne. - 1978. - 20 października. - S. 1,2.
6. Oświadczenie rzecznika rządu Polskiej Rzeczypospolitej Ludowej // Słowo Powszechne. - 1978. - 18 października. - S. 1.
7. Depesza L. Breżniewa do Papieża Jana Pawia II // Słowo Powszechne. - 1978. - 20 października. - S. 1.
8. Depesza od E. Gierka, H. Jabłońskiego i P. Jaroszewicza // Słowo Powszechne. - 1978. - 19 października. - S. 1.
9. Depesza Jana Pawła II do E. Gierka, H. Jabłońskiego i P. Jaroszewicza // Słowo Powszechne. 1978. - 23 października. - S. 1.
10. Kąkol K. Spowiedź pogromcy Kościoła. Olsztyn: «ETHOS», 1994. - S. 98.
11. H. Jabłoński weźmie udział w inauguracji pontyfikatu Jana Pawła II // Trybuna Ludu. 1978. - 20 października. - S. 1.
12. Przewodniczący Rady Państwa PRL u Ojca Świętego Jana Pawła II. Audiencja dla zagranicznych misji specjalnych // Słowo Powszechne. 1978. - 25 października. - S. 1.
13. Kąkol K. Spowiedź pogromcy Kościoła. Olsztyn: «ETHOS», 1994. - S. 117-118.
14. Minister K. Kąkol w sprawie przyjazdu Papieża do Polski // Słowo Powszechne. 1978. - 24 października. - S. 1.
15. Kąkol K. Spowiedź pogromcy Kościoła. Olsztyn: «ETHOS», 1994. - S. 131.
16. Wizyta Papieża Jana Pawła II w Polsce // Chrześcjanin w świecie. - 1979. - № 76. - S. 1.
17. List Przewodniczącego Rady Państwa H. Jabłońskiego do Papieża Jana Pawła II w związku z zaproszeniem do Polski. 2 marca 1979, Warzawa // Kościół Katolicki a państwo w świetle dokumentów 1945 - 1989. T. 3. Lata 1975 - 1989. Poznań-Pelplin: W drodze-Bemardinum, 1996. - S. 129.
18. Zasady akredytacji dziennikarzy polskich i obsługi prasowej wizytu Papieża w Polsce. Wydział Prasy, radia i telewizji KC PZPR // Kultura. Paryż: Instytut Literacki, 1979. - № 7. - S. 233 - 238.
19. Шульц Т. Иоанн Павел II. Минск: ООО «Попурри», 2000. - С. 361.
20. Jan Paweł II. Nauczanie społeczne. Pielgrzymka do Polski 1979. W.: Ośrodek dokumentacji i studiów społecznych, 1982. - S. 7.
21. Ibid. - S. 201 -202.
22. Ibid. - S. 14-15.
23. Ibid. - S. 7, 86, 91.
24. Ibid. - S. 217-218.